Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

# ВЫДАННІ ПА ГІСТОРЫІ ПОЛАЦКА XVI–XX стст. «MIESIĘCZNIK POŁOCKI» Ў ФОНДАХ АДДЗЕЛА РЭДКІХ КНІГ І РУКАПІСАЎ ЦНБ НАН БЕЛАРУСІ

*Дзенісенка А.П.*
*(г. Мінск, Рэспубліка Беларусь)*

Адзін з самых старажытных гарадоў Усходняй Еўропы г. Полацк упершыню згадваецца ў «Аповесці мінулых гадоў» пад 862 г. У Полацку зарадзілася беларуская дзяржаўнасць і культура, тут з'явіліся на свет Еўфрасіння Полацкая, Францыск Скарына, Сімяон Полацкі. Адсюль родам герой абароны Порт-Артура генерал Раман Кандраценка (1857–1904) і заснавальнік беларускага кіно Юрый Тарыч (1885–1967, сапраўднае імя Юрый Віктаравіч Аляксееў).

Ураджэнцам Полацка быў выдатны дзеяч культуры агульнаеўрапейскага маштабу Сімяон Полацкі. Манах, які праз свой светапогляд веруючага чалавека распаўсюджваў у грамадстве менавіта рэлігійныя каштоўнасці, карыстаючыся пры гэтым рознымі, у тым ліку свецкімі сродкамі, ужываючы самыя высокія на той час веды і тэхналогіі, размаўляючы на сучаснай мове. З 1656 г. ён працаваў у Полацку настаўнікам брацкай школы Богаяўленскага манастыра. Ёсць меркаванні, што Сімяон Полацкі вучыўся ў Віленскай езуіцкай калегіі. Зімой 1660 г. ён наведаў Маскву, дзе сустрэўся з царом і, відаць, прасіў яго аб матэрыяльнай дапамозе Богаяўленскаму манастыру. Вясной 1664 г., каб пазбегнуць рэпрэсій з боку польскіх улад, Сімяон Полацкі назаўсёды пераехаў у Маскву. Пасля гэтага пачаўся росквіт паэтычных здольнасцей Сімяона Полацкага. За 16 гадоў жыцця ў Маскве (1664–1680) паэт напісаў вялікую колькасць вершаў, дзве п'есы, некалькі твораў царкоўна-рэлігійнага характару, пераклаў на вершы і ў 1680 г. выдаў «Псалтирь рифмотворную», якая з'явілася першым друкаваным паэтычным



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by



зборнікам у Маскоўскай Русі [11, с. 116–122]. Экзэмпляр «Псалтири рифмотворной» пад шыфрам К16-18/Ср226 захоўваецца ў фондах аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (ЦНБ НАН Беларусі) [2].

У ЦНБ НАН Беларусі захоўваюцца выданні пра жыццё і асветніцкую дзейнасць Еўфрасінні Полацкай. Асноўная крыніца біяграфічных дадзеных пра асветніцу – яе жыццяпіс. Фонды бібліятэкі маюць некалькі друкаваных варыянтаў «Жыццяпісу», перавыданні больш позніх часоў. Сярод іх кніга пад рэдакцыяй вядомага беларускага гісторыка, археографа, краязнаўцы Аляксея Парфенавіча Сапунова (1851–1924). Аўтар твораў па гісторыі і этнаграфіі Віцебшчыны, удзельнік стварэння Віцебскага царкоўна-археалагічнага музея, у 1888 г. надрукаваў у адным томе тры варыянты «Жыццяпісу», адзін яго асобнік быў падораны бібліятэцы Віцебскай вучонай Архіўнай камісіі, аб чым сведчыць яго аўтограф на вокладцы кнігі. Сярод іншых крыніц пра жыццё і дзейнасць Еўфрасінні Полацкай – кніга на польскай мове І. Стэбельскага «Жыцці Еўфрасінні і Параскевы...» (Львоў, 1866 г.) [16], выданні М. Дуброўскага «Житие преподобной Ефросинии...» (Масква, 1894) [2], А. Тыртава «Некоторые пояснения к описанию жития Преподобной Ефросинии...» (Віцебск, 1893) [13], таксама сучаснае юбілейнае выданне да 100-годдзя пераносу святых мошчаў Еўфрасінні з Кіева ў Полацк «Полоцкое Радование: Свято-Евфросиниевские Торжества 1910 г.» [8].

Некалькі кніг прысвечаны дзеду Еўфрасінні, полацкаму князю Усяславу, які быў, па сутнасці, заснавальнікам беларускай дзяржаўнасці. Гэта – артыкул гісторыка і педагога, выкладчыка Віцебскага настаўніцкага інстытута Дзмітрыя Леанардава «Полацкі князь Усяслаў і яго час», надрукаваны ў часопісе «Полоцко-Витебская старина» (1912–1916) [4; 5], і кніга этнографа Сяргея Сахарава «Полацкі князь Усяслаў – беларускі нацыянальны асілак» (1939) [10].



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by



У 2012 г. у ЦНБ НАН Беларусі адбылася прэзентацыя факсімільнага выдання «Издательства Белорусского Экзархата» – «Житие блаженной Евфросинии, игумении монастыря Вседержителя Святого Спаса во граде Полоцке» (сер. XVI в.) [3], прымеркаваная да 1150-годдзя Полацка. Гэта адзін з найбольш ранніх помнікаў усходнеславянскай агіяграфіі. Першапачатковы тэкст «Жития» не захаваўся, да нашых дзён дайшлі толькі перапрацаваныя тэксты. Невядомы і складальнік «Жития», але даследчыкі лічаць, што гэта быў не толькі сучаснік Еўфрасінні, але, безумоўна, асоба з яе асяроддзя (магчыма манах з манастыра, заснаванага Святой).

У фондах аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі захоўваюцца полацкія гістарычныя кнігазборы, выданні Полацкага езуіцкага калегіума XVIII ст., гістарычныя хронікі XVI ст. на польскай і лацінскай мовах. Сярод іх – «Хроніка польская, літоўская, жамойцкая і ўсяе Русі» Мацея Стрыйкоўскага (1582) [17], «Хроніка Еўрапейскай Сарматыі» Аляксандра Гваньіні (1611) [15], якія ўключаюць звесткі перыяду Лівонскай вайны (1558–1583), у ходзе якой Полацк неаднаразова станавіўся аб'ектам заваёў. Дарэчы, на форзацы кнігі Мацея Стрыйкоўскага прыклеены два розныя экслібрысы (адзін з іх рознакаляровы; выканаўца Елізавета Бём (1843–1914) – знакамітая мастачка, удзельніца міжнародных выстаў у Парыжы, Мюнхене, Мілане, адзначана ўзнагародамі). Экслібрысы належаць графу С.Д. Шарамецеву (1844–1918). Відавочна, што гэты фаліянт з яго ўласнай бібліятэкі.

У кнігасховішчы аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў захоўваюцца кнігі полацкіх друкарняў. Гэта выданні тыпаграфіі Полацкага езуіцкага калегіума (з 1812 г. – Полацкая езуіцкая акадэмія), якія дзейнічалі у 1787–1820 гг. Пры друкарні была словалітня, шрыфты атрымлівала з Пецярбурга і Варшавы. Друкарня выпусціла больш за 500 выданняў, пераважна на польскай і лацінскай мовах, часткова на ру-



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by



скай, італьянскай, нямецкай, французскай. Сярод іх – падручнікі для вучняў па ўсеагульнай геаграфіі і гісторыі Рыма, граматыцы лацінскай мовы, майстэрстве рыторыкі, слоўнікі, творы пісьменніка І. Беніслаўскага, выданні рымскіх пісьменнікаў Гарацыя, Цыцэрона. У фондах аддзела захоўваецца асобнік з кнігазбору Бібліятэкі Нясвіжскай ардынацыі – падручнік граматыкі на лацінскай мове Мануэля Альварыса (1526–1582) з экслібрысам Ержы Радзівіла на форзацы («Emmanuelis Alvari… de Institutione grammatical linguae Latinae…», 1794) (мал. 1), выдадзены ў тыпаграфіі Полацкага езуіцкага калегіума.




**Мал. 1.** Тытульны ліст падручніка граматыкі на лацінскай мове Мануэля Альварыса (1526–1582) «Emmanuelis Alvari… de Institutione grammatical linguae Latinae…» (1794) з экслібрысам Бібліятэкі Радзівілаў Нясвіжскай ардынацыі



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by



З канца XVIII ст. у друкарні выходзіў «Каляндар полацкі», дзе змяшчаліся краязнаўчыя матэрыялы (у тымліку пра Полацк), а таксама звесткі па гуманітарных і фізіка-матэматычных навуках, крытыка-бібліяграфічныя агляды, пераклады, апісанні падарожжаў.

У друкарні Полацкай езуіцкай акадэміі з 1818 г. да лютага 1820 г. выходзіла перыядычнае выданне «Miesięcznik Połocki» («Полацкі месячнік») (мал. 2). Асобнік першага нумара за 1818 г. захоўваецца ў адзеле рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі. Выданне паступіла з дублетнага фонду бібліятэкі Львоўскага ўніверсітэта ў 1971 г. У кожным нумары прастаўлены штамп памерам 12 мм – «Biblioteka mokslų Akademijos»[1].

Гэта сціплае па сваім мастацкім афармленні выданне, гравюр у ім мала, для аздаблення выкарыстоўваўся аборны арнамент і ксілаграфічныя застаўкі.

Так, арыгінальныя вокладкі аздоблены двайным наборным арaментам у выглядзе прамавугольнай


MIESIĘCZNIK
POŁOCKI.
Tom I.
Rok 1818.
Quid verum atque decens curo & rogo, & omnis in hoc sum. Horatius L. Ep. 1.
w POŁOCKU
w Drukarni Akademickiey.

**Мал. 2.** Тытульны ліст часопіса «Miesięcznik Połocki» (1818. Т. 1)

[1] Штамп Бібліятэкі Літоўскай Акадэміі навук.



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by



рамкі, у якой змешчаны загаловак, год, месяц, нумар часопіса. На вокладцы цытуецца выслоўе Гарацыя на латыні: «Quid verum atque decens curo et rogo, et omnis in hoc sum» («Што праўдзіва і прыгожа, пра тое клапачуся і пытаюся і ўвесь таму адданы»).

Праваслаўныя гісторыкі імкнуліся ўсяляк зняважыць «Miesięcznik Połocki», называлі яго «журнальчиком» [9]. Між тым, часопіс меў шэсць аддзелаў: літаратура і свабодныя навукі, маральна-філасофскі, фізіка-матэматычны, гісторыя, крытыка, літаратурныя веды. На старонках часопіса побач з гістарычнымі, статыстычнымі і літаратуразнаўчымі матэрыяламі друкаваліся і мастацкія творы, да прыкладу, пераклад трагедыі Еўрыпіда «Арэст», зроблены віцяблянінам Янам Мігановічам. У 14 нумарах, якія паспелі пабачыць свет, было змешчана 85 артыкулаў, у тым ліку ўрыўкі са старажытных рукапісаў акадэмічнай бібліятэкі, якая налічвала, дарэчы, 40 тыс. тамоў. На яго старонках друкавалася шмат артыкулаў як выкладчыкаў, так і студэнтаў Полацкай альма-матэр.

У часопісе прафесары Полацкай езуіцкай акадэміі выступалі з палемічнымі артыкуламі супраць віленскіх публіцыстаў. Палеміка паміж асветнікамі і клерыкаламі сведчыла аб высокім узроўні грамадска-палітычнай думкі Беларусі таго часу. Яна служыла выхаванню талерантнасці, павагі і памяркоўнасці да людзей іншых поглядаў.

На старонках артыкула друкаваўся прафесар філасофіі Вінцэнцій Бучынскі. Ён набыў шырокую вядомасць удзелам у палеміцы, якая разгарнулася паміж асветнікамі і езуітамі (прафесарамі Віленскага ўніверсітэта і Полацкай езуіцкай акадэміі) на старонках часопісаў «Miesięcznik Połocki» і «Dziennik Wileński» [1, с. 67].

Часопіс выступаў супраць гістарычнай літаратуры, перакладзенай з замежных моў, у якой не падзялялася тэалагічная канцэпцыя гісторыі. Між іншым, тэалагі-



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by



чная канцэпцыя гісторыі не перашкодзіла езуітам ажыццявіць на старонках часопіса шэраг цікавых публікацый па гісторыі Беларусі, якія захоўваюць сваю каштоўнасць да нашых дзён. Напрыклад, у трох першых сшытках часопіса друкуецца вялікі і грунтоўны артыкул «Кароткае паведамленне аб горадзе Полацку» («Krótka wiadomość o mieście Połocku») невядомага аўтара. Рускі гісторык, краязнавец, археолаг А. Сапуноў у сваёй брашуры «Заметка о коллегии и академии иезуитов в Полоцке» прызнаў яго самым лепшым артыкулам часопіса [9]. Аўтар разглядае жыццё Полацка з розных бакоў: геаграфічнае становішча і кліматычныя ўмовы, гістарычнае мінулае і статыстычныя звесткі аб жыцці горада на пачатку 1818 г. У артыкуле дадзены звесткі пра клімат нашага краю: у прыватнасці, можна даведацца, што з 1782 да 1817 г. найвышэйшая тэмпература ў Полацку была 22 ліпеня 1805 г. – +30,5°С, а найніжэйшая 26 студзеня 1816 г. – -32°С. Гістарычнае мінулае падаецца нібы ў выглядзе хронікі і пачынаецца са старажытнага рукапісу Нестара «аб палачанах над ракой Палотай жывучых», потым апісваюцца войны Полацкага княства, вялікі голад у 1600 г., калі езуіцкая калегія карміла па 300–400 жабракоў. Далей аўтар піша, што каго не замарыў голад, таго дабіла смяротная хвароба. У 1705 г. у Полацку быў Пётр І, у маі 1780 г. – Кацярына ІІ, у 1802 і 1807 гг. – Аляксандр І. 11 ліпеня 1808 г. у горадзе адбыўся вялікі пажар, у якім згарэла 240 дамоў. У 1812 г. адкрылася езуіцкая акадэмія і пачалася вайна.

Часопіс паведамляў, што ў Полацку 18 садоў, пераважна вішнёвых і яблыневых. З 12 вялікіх вуліц толькі 3 брукаваныя, а па 34 малых увесну лепей прабірацца, трымаючыся як мага бліжэй да плота. Праз горад праходзяць тры паштовыя тракты (пецярбургскі, рыжскі ды віцебска-магілёўскі) і пяць купецкіх: віленскі, лепельскі і бешанковіцкі на левым баку Дзвіны, дзісненскі з невельскім – на



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by



правым. Шырыня Дзвіны сягае 90 сажняў («вада чыстая і здаровая»). Насельніцтва: 171 духоўная асоба, 2178 хрысціян, 9 цыганоў і 2588 яўрэяў. Высокая смяротнасць, асабліва сярод яўрэйскіх дзяцей. У 1817 г. памерла 85 хрысціянскіх дзяцей і 308 іудзейскіх. Яўрэі не дазвалялі рабіць сваім малым вакцыны супраць воспы, што і стала галоўнай прычынай шматлікіх смярцей.

Звычаі ў Полацку былі такія ж, як і ў іншых гарадах. Шляхта бавіла час у вясёлых кампаніях, займалася цывільнымі справамі. Мяшчане – рамяством або гандлем. Яўрэі былі рамеснікамі, купцамі, карчмарамі. Езуітам належала сукнавальня, дзе выраблялі добрае сукно. У трох вярстах ад горада быў медны завод. Існавала некалькі гарбарняў, дзе выраблялі добры саф’ян. У горадзе працавала невялікая колькасць ганчароў, кавалёў, ювеліраў, гадзіншчыкаў і г. д.

Тры разы на тыдзень у Полацку былі таргі: у нядзелю, сераду і пятніцу. Два разы на год – кірмашы, дзе гандлявалі збожжам, жывёлай, птушкай, рознымі вырабамі. З Санкт-Пецярбурга, Масквы, Вільні, Рыгі прывозілі ў горад тканіны, цукар, каву, віно, посуд, прысмакі, фарфор.

У артыкуле таксама публікаваліся матэрыялы пра дзейнасць акадэміі, якая, апрача ўсяго, займалася дабрачыннасцю. Напрыклад, 56 дзяцей беднай шляхты мелі ў семінарыуме бясплатнае памяшканне, кнігі, ежу і лекі; 67 полацкіх шкаляроў кармілі задарма. Дзяўчаты-беспасажніцы вучыліся ў доме для бедных. Існавала дзве багадзельні: адна за кошт езуітаў, другая – праваслаўнай Пакроўскай саборнай царквы [14, с. 59–60].

Калі б часопіс полацкіх езуітаў не перастаў выходзіць у сакавіку 1820 г., такіх публікацый было б, відаць, значна больш. Што быў намéр гэта рабіць, несумненна. «Калі ж з цягам часу, – адзначала рэдакцыя часопіса, – у руках выдаўцоў акажуцца матэрыялы, якія тычацца мясцовай даўніны – старажытныя помнікі, манеты, рукапісы, – яна пры-



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by



кладзе ўсе старанні, каб аб гэтым пастаянна паведамляць чытачам»[2]. На жаль, 13 сакавіка 1820 г. выйшаў указ, па якому езуітаў высылалі па-за межы дзяржавы. Зачынена была і акадэмія, а яе маёмасць (у тым ліку друкарня і бібліятэка) перададзена ў Віцебскую казённую палату.

Такім чынам, «Miesięcznik Połocki» з'явіўся адным з першых часопісаў на абшары дарэвалюцыйнай Беларусі. Сёння гэта бібліяграфічная рэдкасць, якая адносіцца да кніжных помнікаў, вывучэнне якіх патрэбна для айчыннай навукі, гісторыі і культуры.

У аддзеле рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі ў рукапісным фондзе «Калекцыя» захоўваюцца рукапісныя матэрыялы XVII–XVIII стст. па гісторыі Полацка. Сярод іх гандлёвыя, зямельныя і судовыя дакументы, звязаныя з Полацкам і полацкай зямлёй.

***Рукапісныя матэрыялы па гісторыі Полаччыны з фонду «Калекцыя»:***

1. Инвентарь, акт ограничения, доверенности и др. материалы на владение им. Хоцеевичи Полоцкого воеводства 1649 г. Ф. 23, оп. 1, ед. хр. № 183.

2. Квитанция об уплате Цехановецкой подымного налога с им. Голубичи Полоцкого воеводства 1691 г. Ф. 23, оп. 1, ед. хр. № 195.

3. Судебное решение по делу Сапеги Бенедикта с Лукомским Теодором и Шанявским Павлом о задержке и нанесении ущербов московским купцам 1697 г. Ф. 23, оп. 1, ед. хр. № 200.

4. Свидетельство Ольшевского Петра, выданное Вазгирду Игнатию о непричастности его к нападению на эконома им. Голомысль Полоцкого воеводства Рыдевского Игнатия. 1780 г. Ф. 23, оп. 1, ед. хр. № 218.

5. Свидетельство возного о вручении вызова в суд по делу Сильвестровича Александра, Мицевича Игната и док-

[2] Змешчана на адвароце вокладкі «Miesięcznik Połocki» (1818. № 1).



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by



шицкого мещанина купца Израилевича с полоцкими базилианами 1787 г. Ф. 23, оп. 1, ед. хр. № 234.

Даследаванні полацкіх старажытных рукапісаў знайшлі сваё адлюстраванне на старонках двухтомнага факсімільнага выдання «**Полоцкие грамоты XIII – начала XVI века» [6; 7]. Гэта сумесны праект расійскіх і беларускіх вучоных, адзін з яго аўтараў – доктар гістарычных навук, дырэктар ЦНБ НАН Беларусі А.І. Груша.** У выданні разглядаюцца старажытныя дакументы па гісторыі Полацкай зямлі за перыяд 1263–1511 гг.: узаемаадносіны паміж Полацкам і Рыгай, дакументы Вялікага Княства Літоўскага, пасланні полацкіх епіскапаў і інш. Помнікі полацкага пісьменства ахопліваюць шырокае кола эканамічных, палітычных, міжканфесійных пытанняў і з'яўляюцца сведкамі шматвяковых стасункаў палачан з іх суседзямі.

Такім чынам, у фондах аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў захоўваюцца кніжныя і рукапісныя дакументы XVI–XX стст. па гісторыі Полацка. Самыя раннія – гістарычныя хронікі Мацея Стрыйкоўскага «Хроніка польская, літоўская, жамойцкая і ўсяе Русі» (1582) і Аляксандра Гваньіні «Хроніка Еўрапейскай Сарматыі» (1611). У асобніках XVI–XX стст. былі выяўлены кніжныя пазнакі, сярод якіх рэдкія экслібрысы князёў Радзівілаў і графа С.Д. Шарамецева.

Рукапісныя і кніжныя дакументы па гісторыі Полацка з фондаў ЦНБ НАН Беларусі з'яўляюцца сведкамі тых падзей, што адбываліся на працягу XVI–XX стст. на полацкіх землях. У іх раскрываюцца асаблівасці беларусаў як прадстаўнікоў асобнай нацыі, прасочваецца шлях, па якому ішло адраджэнне і самавызначэнне беларускага народа.



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by



## ЛІТАРАТУРА

1. **Арлоў, У.** Alma Mater Polocensis / У. Арлоў // Беларуская Мінуўшчына. – 1996. – № 3. – С. 66–70.

2. **Дубровский, М.** Житие преподобной Ефросинии, княжны Полоцкой, с кратким описанием основанного ею в Полоцке женского монастыря / М. Дубровский. – Изд. 3-е, испр. и доп. – Москва : [б. и.], 1894. – 25 с.

3. **Житие** блаженной Евфросинии, игумении монастыря Вседержителя Святого Спаса во граде Полоцке : [в 2 кн.] / Федеральное государственное бюджетное учреждение «Российская национальная библиотека», Издательство Белорусского Экзархата Московского Патриархата, Государственное учреждение «Национальная библиотека Беларуси» ; [руководители проекта: Владимир Грозов, Александр Велько ; оцифровка: Георгий Лихтарович]. – Факсимильное воспроизведение из фонда Федерального государственного бюджетного учреждения «Российская национальная библиотека» (собрание Погодина, № 869, листы 318 об. – 332). – Минск : Белорусская Православная Церковь (Белорусский Экзархат Московского Патриархата), 2012. – (На церковнославянском языке).

4. **Леонардов, Д. С.** Полоцкий князь Всеслав и его время / Д. Леонардов // Полоцко-Витебская старина / издание Витебской ученой архивной комиссии. – Витебск : Типо-Лит. Насл. М. Б. Неймана, 1912. – Вып. II. – С. 121–216.

5. **Леонардов, Д. С.** Полоцкий князь Всеслав и его время (Продолжение) / Д. Леонардов // Полоцко-Витебская старина / издание Витебской ученой архивной комиссии. – Витебск : Типо-Лит. Насл. М. Б. Неймана, 1916. – Вып. III. – С. 87–180.

6. **Полоцкие** грамоты XIII – начала XVI века / [Институт славяноведения Российской академии наук и др.]. – Москва : Университет Дмитрия Пожарского, 2015. – Т. 1 / А. Л. Хорошкевич (отв. ред.) [и др.]. – 851 с. – (Серия «Источники. История»).

7. **Полоцкие** грамоты XIII – начала XVI века / [Институт славяноведения Российской академии наук и др.]. – Москва : Университет Дмитрия Пожарского, 2015. – (Серия «Источники. История»). – Т. 2 / А. Л. Хорошкевич (отв. ред.) [и др.]. – 520 с.



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by



8. **Полоцкое** Радование: Свято-Евфросиниевские Торжества 1910 года / [ред. А. Г. Борисова-Горюнова ; худ. А. П. Маковцов]. – Полоцк : Свято-Евфросиниевский женский монастырь в г. Полоцке Полоцкой епархии Белорусской Православной Церкви, 2010. – 437, [2] с. (По благословению высокопреосвяшеннейшего Феодосия, Архиепископа Полоцкого и Глубокского. Посвящается 100-летию перенесения мощей преподобной Евфросинии из Киева в Полоцк, 1910–2010).

9. **Сапунов, А. П.** Заметка о коллегии и академии иезуитов в Полоцке / А. Сапунов. – Витебск : Типография губернского правления, 1890. – 34 с.

10. **Сахараў, С. П.** Князь Усяслаў – нацыянальны беларускі асілак / С. П. Сахараў. – Вільня : Бел. друк імя Ф. Скарыны, 1939. – 17 с.

11. **Симеон** Полоцкий и его книгоиздательская деятельность / АН СССР, Ин-т мировой лит. им. А. М. Горького. – Москва : Наука, 1982. – 352 с. – (Русская старопечатная литература (XVI – первая четверть XVIII в.).

12. **Симеон** Полоцкий. Псалтирь рифмотворная. – Москва : Верхняя тип., знаменил 7188 [1680].

13. **Тыртов, А. П.** Некоторые пояснения к описанию жития Преподобной Ефросинии, княжны Полоцкой / А. П. Тыртов. – Витебск : Губ. тип., 1893. – 25 с.

14. **Філатава, А.** Полацак 1818. Па матэрыялах часопіса «Miesiecznik Polocki» / Алена Філатава // Беларускі гістарычны часопіс. – 1993. – № 1. – С. 59–60.

15. **Gwagnin, A.** Zbior dziejopisow polskich we czterech tomach zawarty : perwszy r. 1578 po lac. wyd., a teraz zprzyczynieniem tych krolow, ktorych w lac. miemasz.... T. 4, Kronika Sarmacycy Europskiej, w ktorey sie zamyka Krolestwo Polskie ze wszystkiemi Panstwy, Ksiestwy y Prowincyami swemi... / przez Aleksandra Gwagnina z Werony... rycerza panowanego i rotmistrza J. K. Mci ; przez tegoz autora z wielka pilnoscia rozdzialami na X ksiag krociuchno zebrana a przez Marcina Paszkowskiego za staraniem autorowym z lac. na pol. przel. – [Krakow : s. n.], 1611. – 714 s.

16. **Stebelski, Ignacy.** Dwa wielkie swiatla na horyzoncie polockim z cieniow zakonnych powstajace czyli Zywoty SS. panien i matek Eufrozyny i Parascewii zakonnic i hegumenij... : z chronologia



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by



i przydatkiem niektorych sluzacyxh do tego pozytecznych krajowych wiadomosci z rozmajitych dziejopisow i pism / zebr. przez W. X. Ignacego Stebelskiego. – Lwow : nakl. Ksieg. Igla, 1866. – T. 1. LXXIV, 185, 4 s.

17. **Stryjkowski, M.** Ktora przedtem nigdy swiatla nie widziala Kronika Polska, Litewska, Zmodzka i wszystkiey Rusi Kijowskiey, Moskiewskiej, Siewierskiey, Wolhinskiej, Podolskiej, Podgorskiej, Podlaskiey etc. : i rozmaite przypadki woienne i domowe... z rozmaitych historykow i autorow postronnych i domowych... starych, dotad ciemnochmurna noca zakrytych chronik i Latopisczow Ruskich, Litewskich i Dlugosza Ojca dziejow Polskich... / przez Macieja Osostewiciusza Stryjkowskiego dostatecznie napisana... z laska i priwilejem K. J. M. – Korolewiec : u Jerzego Odtenberga, 1582. – 791 s.


Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by